УДК 821.161.3-311.6

Вуч. А. В. Максіменка
Навук. кір. Л. А. Падвойская, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Гімназія г. Асіповічы")

# ПЕЙЗАЖ У АПОВЕСЦІ «ЖУРАЎЛІНЫ КРЫК» В. БЫКАВА

У беларускай літаратуры тэма вайны застаецца галоўнай. Для Васіля Быкава яна была галоўнай і адзінай.

Пры разглядзе малюнкаў да аповесці В.Быкава "Жураўліны крык" якія зрабілі вучні 8-ых класаў, мяне здзівіў той факт, што большасць з іх – пейзажныя. Чаму? Нямногія даследчыкі творчасці В. Быкава звярталі ўвагу на асаблівасці пейзажных замалёвак ў аповесцях пісьменніка. У сваёй рабоце я вырашыла паспрабаваць даць адказ на пытанне. Навізна майго даследавання заключаецца ў тым, што я паспрабую вызначыць, што з'яўляецца галоўным сродакам уздзеяння на чытача ў літаратурным творы і ў творах выяўленчага мастацтве – гэта мэта маёй работы**.** Яна рэалізуецца праз вырашэнне наступных **задач:**

- вызначыць мастацкую канцэпцыю пейзажаў ў аповесці В. Быкава «Жураўліны крык;
- правесці аналіз пейзажных замалёвак з аповесці " Жураўліны крык" і малюнкаў вучняў.

Літаратурныя пейзажныя замалёўкі ў аповесці "Жураўліны крык" В. Быкава шматфункцыянальныя: цесна звязаны з сюжэтнымі калізіямі і ствараюць рэалістычнае ўспрыманне вобразаў і з'яў прыроды. Праведзены аналіз мастацкага тэксту даў магчымасць вызначыць галоўную адметнасць пейзажных замалёвак - наяўнасць "дамінанты" (ад лацінскага dominans, dominantis) – важнейшая састаўная частка чаго-небудзь. У пейзажных замалёўках аповесці "Жураўліны крык" ёсць дамінанты – гэта вецер, дождж, туман, сонца – з'явы прыроды. Іх ужыванне паказана ў табліцы 1.

**Табліца 1 – Статыстыка ўжывання дамінант у пейзажах аповесці В. Быкава "Жураўліны крык"**

| Дамінанта | Колькасць |
|---|---|
| Вецер | 19 |
| Дождж | 12 |
| Туман | 7 |
| Сонца | 6 |

Адлюстраванне прыроды ў творах мастацтва як у прозе, так і ў жывапісе – гэта не толькі маляўнічае выяўленне яе прыгажосці, але і паказ эмацыянальнага ўспрымання. Я прааналізавала пейзажы аднакласнікаў, яны тэматычна блізкія: на ўсіх асеннія пейзажы, адлюстраваны пэўны стан ці нават момант прыроды, характарызуюцца малой колькасцю дэталяў. Адлюстраванне прыроды − гэта перш за ўсё працэс унутранага выяўлення эстэтычных уражанняў ад прычытанага літаратурнага твора. Як адзначаў М. Горкі: "Ад зліцця, супадзення вопыту літаратара і вопыту чытача і атрымліваецца тая мастацкая праўда – тая асаблівая пераканальнасць слоўнага мастацтва, якім і тлумачыцца сіла ўздзеяння літаратуры на людзей". Гэтыя словы з'яўляюцца гіпотэзай майго даследавання. Каб праверыць гэта меркаванне, я правяла анкетаванне сярод аднакласнікаў і настаўнікаў, якія разглядалі малюнкі вучняў. А іх адказы і назіранні я сістэматызавала і прадставіла ў табліцы 2.

**Табліца 2 - Ужыванне дамінант у малюнках вучняў**

| Дамінанта | Нумар малюнка | | | | | | | | | Коль-касць |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | |
| Вецер | + | + | + | + | | + | | + | + | 7 |
| Дождж | + | | | | | + | | | + | 3 |
| Туман | | | | | + | | | + | | 2 |
| Сонца | | | + | + | + | | + | | + | 5 |

Як у літаратурным творы, так і ў малюнках вучняў дамінанты былі аднолькавыя. А гэта значыць, што дамінанты ў пейзажах сапраўды ўздзейнічаюць на пачуцці чытачоў і фарміруюць асабістае ўспрыманне твора. Вынікае , што гіпотэза – правамерна.

УДК 821.161.3.09

Вуч. Я.В. Мархалюк
Нав. кір. А.М. Фалейчык, настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
А.А. Клімковіч, нам. дырэктара гімназіі
(ДУА "Гімназія № 192 г. Мінска")

## АБУДЖЭННЕ ВУЧНЁЎСКАЙ ЦІКАВАСЦІ ДА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРАЗ МАЛАВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ ЖЫЦЦЯ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

Трэці год мы займаемся навукова-даследчай работай па тэме "Малавядомыя старонкі біяграфіі Аркадзя Куляшова". Падчас пошуку і аналізу матэрыялу зразумела, што пра ўсе цікавыя факты біяграфіі А. Куляшова вельмі хацелася падзяліцца з вучнямі нашай гімназіі.